


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 9 (237) 4 кастрычніка 1996 года, пятніца


## Са святам, з Днём настаўніка Вас, педагогі сённяшнія і будучыя!



***Наш фотакарэспандэнт Ул. Сарокін зрабіў гэты здымак у кабінеце прарэктара па навучальнай працы, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара І.П.Мартынава ў той момант, калі з дацэнтамі матфака Н.С. Бярозкінай і В.А. Пронька яны абмяркоўвалі праект навуковых даследаванняў універсітэта на перспектыву.***

***Наталля Бярозкіна і Вячаслаў Пронька ўжо самі даўно педагогі, але Іван Платонавіч для іх, як і раней - Настаўнік з вялікай літары. Гэта ён некалі разгледзеў іх, здольных студэнтаў, быў кіраўніком іх дыпломных работ, пасля - дысертацый. Разам яны надрукавалі шэраг грунтоўных навуковых артыкулаў, іх і сёння аб'ядноўваюць агульныя навуковыя тэмы, агульныя распрацоўкі.***

С. БЕРАСТ.

## У МІНСК, НА ВЯЛІКІ СХОД

Працоўны калектыў нашага універсітэта на Усебеларускім народным сходзе будзе прадстаўляць у ліку 650 чалавек ад Гродзенскай вобласці рэктар Л.М. Ківач. Такое рашэнне амаль аднадушна прынялі ўдзельнікі канферэнцыі, што адбылася ў апошняй дэкадзе верасня. Выступаўшыя на канферэнцыі А.М. Шышко, І.І. Вялента, М.В. Васілючак, М.У. Марцён адзначылі, што Леанід Мікалаевіч найлепш ведае праблемы універсітэта і менавіта ён здолее данесці іх Усебеларускаму сходу. Пажадана было б, каб члены працоўнага калектыву універсітэта загадзя давалі свайму вылучэнцу канкрэтныя наказы. Нагадаем, Усебеларускі народны сход адбудзецца 19 кастрычніка ў Мінску.

# Будзе тэлефонны даведнік!

І, можа, нават у гэтым годзе ён будзе пакладзены на службовыя сталы дэканатаў, кафедр, аддзелаў універсітэта. А пакуль работа па яго складанні - у самым разгары. Збіраецца новая і ўдакладняецца існуючая інфармацыя тэлефоннай сеткі. А жыццё, як вядома, не стаіць на месцы: то тэлефонныя нумары змянілі з 45 на 72, то новыя з'явіліся, то службы змянілі месцы дыслакацыі, а значыць, і нумар тэлефона, і г.д. Апошні універсітэцкі тэлефонны даведнік быў складзены ў 1993 годзе. За гэты працяглы час ён цалкам састарэў. З'явіліся шматлікія самаробныя тэлеспісы, не надта дакладныя і не вельмі зручныя. А каб паскорыць работу па стварэнні даведніка ад усіх нас патрабуецца аператыўней паведамляць у канцылярыю універсітэта аб усіх змяненнях у тэлефоннай сетцы. Грунтоўная і адказная праца па складанні даведніка даручана Вікторыі Тамасаўне Сінчыліній. Яна ўжо мае пэўны вопыт у гэтай справе, працуе над трэцім універсітэцкім даведнікам.

*Семінары*

# Карысныя дыскусіі

"Матэматычная адукацыя" - пастаянна дзеючы навукова-метадычны семінар, які ў мінулым годзе працаваў па насычанай праграме. Кіраўнікі яго - прафесар А.А. Пякарскі і дацэнт Ю.П. Залатухін, сакратар - аспірант А.І. Боціс.

Усе сем мінулагодніх пасяджэнняў прайшлі па найбольш актуальных праблемах матэматычнай адукацыі ў вышэйшай школе. У прыватнасці, абмяркоўваліся праблемы курсавога і дыпломнага праектавання на матэматычным факультэце. У ходзе дыскусіі прааналізавана роля задач у выкладанні матэматыкі, абмеркавана роля нестандартнага аналізу і магчымасці яго прымянення ў выкладанні прадмета.

Разглядаліся канцэптуальныя асновы, структура і змест матэматычнай адукацыі ў сярэдняй школе пры 12-гадовым навучанні, а таксама перспектывы выкладання яе на беларускай мове.

На адным з пасяджэнняў размова ішла пра сучасныя метады атрымання навуковай інфармацыі і іх прымяненне ў нашым універсітэце, пра магчымасці выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў навучальным працэсе і навукова-даследчай працы. Увага ўдзельнікаў семінараў акцэнтавалася на праблемах выкладання матэматыкі ва ўмовах рэфармавання сістэмы адукацыі.

Майскае пасяджэнне навукова-метадычнага семінара пачалося з інфармацыі аб жыцці і творчасці Рэнэ Дэкарта, 400-годдзе якога якраз падказаў каляндар. Пасля разам з калегамі з Мінска нашы матэматыкі абмеркавалі больш надзённае - асаблівасці структуры курса геаметрыі і алгебры для базавых школ.

Чэрвеньская выніковая канферэнцыя дала магчымасць абмеркаваць цэлы шэраг вузкаспецыяльных пытанняў і праблем матэматычнай адукацыі. Змястоўнай была і дыскусія, у ходзе якой яе ўдзельнікі ўзнімалі розныя аспекты навукова-метадычнага забеспячэння выкладання матэматыкі.

Бясспрэчна, карысць ад гэтых семінараў вялікая. І нельга не назваць імёны людзей, што рыхтавалі даклады і паведамленні, актыўна ўдзельнічалі ў дыскусіях: А.А. Пякарскі, Ю.П. Залатухін, А.І. Боціс, Т.Э. Можджэр, А.В. Карлюкоў, А.А. Грынь, Н.Н Іваноў, А.М. Мятліцкі. А.А. Крушальніцкі, Л.В. Кірылюк, І.М. Сцяпура, В.А. Губіна, І.К. Жук, Т.І. Капылова, П.В. Стэцка, Н.П. Макарава, І.Б. Праcвірніна, Г.Ч. Шушкевіч, Ф.С. Ляльчук, Л.І. Кеба, а таксама госці з Віцебска, Магілёва, Мінска, Гомеля - К.А. Ананчанка, І.І. Мартынаў, В.А. Горская, М.В. Гваздовіч, А.П. Кузняцова, У.Г. Ермакоў.

Улічваючы карысць падобных семінараў, вырашана, што мэтазгодна працягваць іх работу і ў гэтым навучальным годзе. Пасяджэнні будуць праводзіцца кожную трэцюю сераду месяца ў 14 гадзін. Прыняць у іх удзел запрашаюцца настаўнікі, метадысты, выкладчыкі вышэйшай школы, усе, каго цікавяць праблемы матэматычнай адукацыі.

Заяўкі на ўдзел у семінары можна папярэдне падаваць у пакой № 329.

***Я. КАНДРАТОВІЧ,***
***метадыст навукова-метадычнага аддзела.***



# Победители названы

Завершился II тур университетского конкурса на лучшую методическую разработку внеклассного мероприятия школьников по гражданскому воспитанию. В нем приняли участие 96 студентов. К конкурсу допущено 50 работ. Наиболее активными оказались студенты факультета иностранных языков и факультета педагогики и психологии.

Отобранные работы свидетельствуют о теоретическом знании материала, умении довести его до школьников, владении логикой изложения, наличием взаимосвязи познавательно-мировоззренческих, эмоционально-волевых, практических задач.

Комиссия с удовлетворением отметила знание студентами разнообразных форм воспитательных мероприятий: это и "Поле чудес", и викторины, и игры-путешествия, и "круглые столы", и праздники.

Работы носят творческий характер, грамотно предусматривают возрастные особенности учащихся, красочно оформлены, богаты содержательно, свидетельствуют о знании и глубоком уважении национальных традиций белорусского народа.

Комиссия приняла решение считать занявшими I место две работы. Это викторина для старшеклассников по истории культуры Беларуси, разработанная студентами III курса факультета иностранных языков Ириной Копач и Дмитрием Колесниковым. В их работе использованы различные источники, монографии, художественные произведения, журнальные статьи по истории Беларуси. Вторая работа, занявшая 1-е место, также принадлежит студентам-третьекурсникам факультета иностранных языков Надежде Брагинской и Павлу Кахно, ее тема: "Рождество: знакомство через Библию, его истоки и особенности празднования на Беларуси". И здесь содержится интересный наглядный материал по теме. 2-е место присуждено трем работам: студенткам III курса факультета иностранных языков Ульяне Богачевой и Лидии Ванчель за разработку "Гульні - падарожжа па роднаму гораду" для 5-6 классов. Работа интересна своим практическим использованием. Студентки блестяще применили игровую методику, знание краеведения, возможности по-новому изучить известные исторические места г. Гродно.

Комиссия единодушно высоко оценила работу Виктории Нечухриной "А на Івана-Купалу", которая сумела не только интересно предложить свой вариант проведения фольклорного праздника, но и красочно, с любовью оформить свою работу.

Третья работа, занявшая 2-е место, принадлежит Ольге Буйко и Наталье Варенич (III курс факультета иностранных языков). Студентки предложили сценарий удивительно богатой по содержанию игры "Жывуць людзі, пакуль жыве памяць іх..."

3-е место присуждено студенткам факультета психологии и педагогики Ольге Мясниковой, Наталье Савко, Наталье Савчук (III курс) за методическую разработку театрализованного представления по экологическому воспитанию младших школьников "Поучительная история, которая может случиться с каждым из нас". Работа снабжена рисунками и меткими пояснениями.

Следующей отмечена работа студентки III курса факультета иностранных языков Елены Савонь за попытку самостоятельно разобраться в "белых пятнах" истории Беларуси с помощью разработки "круглого стола" для старшеклассников "А может, не было войны?" Елена прочувствовала сама и убедительно показала в сценарии, как важно не забывать испытаний военных лет и уметь разбираться в вечных ценностях добра и зла.

Комиссия единодушно выделила разработку вечера для школьников 7-9 классов. "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася Спадчына" студенток факультета иностранных языков III курса (7 группа) Ирины Шевяковой и Светланы Рыхтар, которые попытались с помощью разнообразного материала вызвать интерес учащихся к историческому прошлому, бережное отношение к родному языку.

Заняла призовое место и разработка познавательной игры "Путешествие в прошлое", которую написали студентки того же факультета III курса Наталья Соловьева и Ольга Сечейко.

Подводя итоги, комиссия надеется, что этот интересный конкурс будет продолжен. Хотелось бы видеть среди участников конкурса не только языковедов и психологов, но и историков, биологов, физиков, математиков, студентов факультета белорусской филологии. Несомненно, и среди них есть творческие личности, способные внести свой вклад в написание методических разработок для школьников.

*Комиссия, организовавшая и проводившая итоги конкурса, надеется, что университет изыщет возможность опубликовать лучшие работы студентов в отдельном сборнике. Это будет уникальный методический материал для учителей города, и все продуманное, выношенное и написанное нашими студентами обретет жизнь.*

***Т. ПРУДКО,***
***зам.декана факультета иностранных языков, председатель комиссии по проведению конкурса.***

*На кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта распрацавана “Перспектыўная праграма па вывучэнню беларускага фальклору ў Гродзенскай вобласці”, якая разглядалася на пасяджэнні кафедры і пасля абмеркавання была ўхвалена. Праграма адкрывае шырокую прастору дзеяння ў збіранні, апрацоўцы, вывучэнні і выданні беларускай вуснай народнай творчасці. Менавіта па ёй кафедра збіраецца працаваць у бліжэйшыя 6-8 гадоў. Падрыхтаваў праграму выкладчык фальклору* ***Казлоўскі Руслан Канстанцінавіч****. Яе мы і прапануем сёння ўвазе нашых чытачоў.*

# З глыбінь народных...

## Перспектыўная праграма вывучэння беларускага фальклору



**Беларускі фальклор** - гэта не толькі крыніца натхнення празаікаў і паэтаў, мастакоў і музыкаў, гэта, у першую чаргу, духоўная крыніца для ўсяго беларускага народа. Нашыя продкі ў песнях і замовах перадавалі агонь нацыянальнага духу сваім нашчадкам, праз хараство прыроды роднага краю выказвалі пачуцці і парыванні народнай душы, ствараючы пры гэтым незвычайна прыгожыя творы. Казкамі, паданнямі і легендамі пранеслі любоў і замілаванне да сваёй Айчыны праз мноства стагоддзяў да нас, новых пакаленняў беларусаў. Фальклор - гэта трывалы падмурак кожнай нацыі, любога народу ў свеце.

У апошнія дзесяцігоддзі на Беларусі назіраецца моцны працэс урбанізацыі, які ў апошнія гады набраў высокія тэмпы. Шмат моладзі пераязджае ў гарады, у вёсках застаюцца ў большасці людзі сталага веку. Разам з гэтым бурыцца тая жыватворная народная духоўная аура, якая стваралася на працягу тысячагоддзяў. Гэтай аурай з'яўляецца беларускі фальклор у яго шырокім і вузкім значэнні. Паступовае знікненне гэтага багатага пласта культуры роўна знікненню душы народа, наносіць непапраўны ўрон для новых пакаленняў грамадзянаў Рэспублікі Беларусь. Апошнія носьбіты беларускіх казак, песняў, паданняў, прыказак, замоў, загадак паступова адыходзяць у нябыт. Сабраць іх духоўную спадчыну, даследаваць, захаваць, перадаць яе нейкім чынам нашчадкам - адна з галоўнейшых нашых задачаў.

Кафедра беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы ў такіх умовах павінна стаць навуковым цэнтрам вобласці па вывучэнню беларускай вуснай народнай творчасці, павінна будзе наладжваць сувязі паміж арганізацыямі і ўстановамі, якія так ці інакш маюць дачыненне да народнай творчасці. Кафедра будзе ініцыіраваць і ажыццяўляць праекты і праграмы па збіранні, апрацоўцы, вывучэнню і выданню твораў беларускага фальклору, што дазволіць паказаць адметнасць духоўнай спадчыны ўсяго Гродзенскага рэгіёну. Праца павінна будзе весціся ў трох накірунках: навуковым, навучальным і спецыяльным.

Зыходзячы з вышэй сказанага, трэба зазначыць, што для выканання вызначаных мэтаў трэба вырашыць шэраг задачаў. А іменна:

- Стварыць новыя праграмы па вывучэнню беларускага фальклору. Улічыць пры іх складанні ўсе недахопы папярэдніх распрацовак, якія нярэдка ствараліся з кан'юнктурна-палітычным падыходам да справы, а таксама распрацаваць новыя методыкі (альбо мадэрнізаваць, дапоўніць старыя) па збіранні фальклору з улікам сучасных умоў.

- Наладзіць шчыльныя сувязі з Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь, Саюзам фалькларыстаў і іншымі арганізацыямі і ўстановамі, якія маюць дачыненне да збірання, даследавання, захавання беларускага фальклору. Гэта дапаможа ў выпрацоўцы адзінай сістэмы даследавання скарбаў народнай культуры не толькі ў Гродзенскім рэгіёне, але і ў кантэксце ўсёй Беларусі.

- Наладзіць навуковыя сувязі з раёнамі Гродзенскай вобласці, стварыць шырокую грунтоўную сетку карэспандэнтаў. Могуць быць таксама арганізаваны фальклорныя цэнтры (назва іх не мае істотнага значэння) пры раённых аддзелах адукацыі, культурных і навучальных установах. Асаблівую ўвагу кафедра будзе надаваць Гродзенскаму абласному інстытуту ўдасканалення настаўнікаў, у які на павышэнне кваліфікацыі з'язджаюцца педагагічныя кадры з усіх куткоў Гродзеншчыны. На базе інстытута можна стварыць першы фальклорны цэнтр, які паслужыць узорам для іншых.

- Кафедра будзе ініцыіраваць і праводзіць навуковыя канферэнцыі, семінары і іншыя мерапрыемствы з шырокім аглядам у прэсе, а таксама арганізуе правядзенне метадычна-выхаваўчых канферэнцый і семінараў для настаўнікаў школаў і выхавацеляў дзіцячых садкоў, бо менавіта гэтая катэгорыя педагагічных работнікаў павінна прывіць у дзяцей любоў да роднага краю, яго звычаяў, казак, паданняў, перадаць маленькім грамадзянам духоўныя скарбы нашага народа.

- Выдаваць на падставе сабраных фальклорных матэрыялаў кожныя 3-5 гадоў зборнік “Фальклор Гродзеншчыны”, наладзіць яго распаўсюджанне. Гэта, безумоўна, пашырыць інфармацыю аб вуснай народнай творчасці, звычаях, абрадах, іх спецыфіцы ў Гродзенскім рэгіёне.

Кафедра лічыць адной з важнейшых задачаў стварэнне моцнай фальклорнай матэрыяльнай базы ў сценах Гродзенскага дзяржуніверсітэту імя Я. Купалы (факультэт філалогіі). Гэта:

а) стварэнне творчай лабараторыі з адпаведным штатам (лабарантамі, інжынерамі). У лабараторыі павінны быць у наяўнасці аудыё-, відэаапаратура, камп'ютар, без якіх немагчымыя збор, класіфікацыя, захаванне матэрыялаў па фальклору;

б) фінансаванне фальклорных практык для студэнтаў, як аднаго, дарэчы, з відаў навучальнай дзейнасці, і камандзіравання выкладчыкаў і супрацоўнікаў;

в) фінансаванне выдавецкай дзейнасці (публікацыя фальклорных зборнікаў і матэрыялаў семінараў, метадычных дапаможнікаў, праграмаў і інш.);

Кафедра беларускай літаратуры ставіць задачай максімальна спрыяць працы фальклорных музычных, танцавальных і спеўных гурткоў, ансамбляў, дзіцячых гурткоў і іншых творчых утварэнняў.

Кафедра будзе наладжваць сувязі з пісьменніцкімі арганізацыямі для правядзення агульных мерапрыемстваў, якія б узаемна ўзбагачалі абодва бакі духоўнымі народнымі каштоўнасцямі і служылі перайманню лепшых традыцый народнай паэтычнай спадчыны асабліва для маладых пісьменнікаў. Такім чынам, будуць пашырацца веды аб беларускім фальклоры ў грамадстве, асабліва ў сценах Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, будучым педагогам будзе прывівацца цікавасць да духоўных скарбаў беларускага народа.

*Выкананне абсалютнай большасці пунктаў разлічваецца на 1997-2002 гады. Гэта дазволіць стварыць базу і зрабіць першыя істотныя крокі ў захаванні духоўнай спадчыны беларускага народа, дазволіць выхоўваць падрастаючае пакаленне на грунце народных звычаяў, абрадаў, песень, казак, традыцый. Такім чынам, Гродзенскі рэгіён удасца падняць на новы, больш высокі ўзровень развіцця фалькларыстыкі, ліквідаваць істотныя недапрацоўкі, якія мелі месца.*



Анатоль Брусевіч

**1 верасьня**

Звыкла баўлю свой час -
Пазіраю ў вакно.
Там нічога няма,
Толькі неба адно.
Толькі хмары паўсюль,
Толькі вецер наўкол.
Усьміхаюсь жыццю.
Вось і ўсё, містэр Тол.

**6 верасьня**

Схіляю галаву прад Вамі,
Мая самотная паэтка.
Ваш шлях як мой, пакрыты
снамі,
Яшчэ - пялёсткамі ад
кветак.
Ваш шлях не будзе
адзінокім
У край Самоты і
Натхненьня.
На жаль, я чую Вашы крокі
Усё далей. І гэта дрэнна.

**7 верасьня**

Я верш не напісаў.
Прабач мяне, мой дзень.
Я зноў уцёк ад спраў,
Хоць іх няма нідзе.
Я зноў пабыў сабой.
Мой лёс сьмяецца з тых,
Хто зблытаў верш са мной,
І выпіў за дваіх.

**11 верасьня**

Каб стаць мяжой між днём
і ноччу,
Я ў шэры колер апрануся.
Тады па верасьнёўскім лузе
Са мною побач час
пакрочыць.
Мы пойдзем зь ім у жоўты
верас,
І водар траў і пах мядунак
І я ня буду болей сумным.
Хоць апрануты ў колер
шэры.

## *ВЕРНУТАЯ ПАЭЗІЯ...*

У паэме "Сказ пра Лысую гару", прысвечанай паэтам і паэзіі, добра вядомы аўтар адзначыў, што ў сталіцы нашай паэтаў дзесьці "тры разы па сто". І толькі застаецца пасля гэтага сумна ўздыхнуць у нашай правінцыяльнай Гародні. І людзей у нас паменей, чым у сталіцы, ну а паэтаў... Дзе іх цяпер вышукаеш...

Але ж калі з цікавасці паварушыць гісторыю, то, мабыць, прыгадае нехта з мясцовых тубыльцаў, што было ж калісьці ў Гродзенскім універсітэце нейкае ці то аб'яднанне, ці то згуртаванне. І давала яно аб сабе знаць даволі зычным голасам (не выпадкова ж ён гучаў над Нёманам), і ў дарогу выправіла не адно пакаленне паэтаў. Але, як канстатуецца ўсё ў той жа паэме, то "быў час, была эпоха..."

Ці няма ўжо ў нас чаго паэтызаваць? Куды ж падзеў гэты час паэтаў? Не. Усё, аказваецца, ёсць у нашым маляўнічым горадзе: і прыгожыя мясціны для натхнення, і стаіць на месцы універсітэт, і вучацца ў ім звычайныя людзі. Але калі-нікалі здараецца з імі нешта незвычайнае, вось як бы казаў пра гэта вядомы класік: "Я не думаў пра вершы, толькі што ты паробіш з душой..."

Так ужо склалася спрадвеку, што паэты былі самым неарганізаваным народам, якому ніяк не даручыш такую далікатную справу, як арганізацыя літаратурнага аб'яднання. Таму аматары паэтычнага слова вырашылі ўзяць гэты абавязак на сябе і ўдыхнуць новыя сілы ў студэнцкае літаб'яднанне "Наднёманскія галасы".

Думаю, што на яго голас збяруцца тыя, каго вабіць прыгожае мастацкае слова і ў каго ёсць імкненне да шчырага выказвання і творчых пошукаў. Адзін з паэтаў ужо згодны заявіць аб сабе, і таму на старонках газеты мы прадстаўляем студэнта 3 курса факультэта філалогіі Анатоля Брусевіча, аўтара паэтычнага зборніка, вершы якога яшчэ раз адкрыюць нам чароўны і заўсёды такі непрадказальны свет паэзіі.

***С. ТАРАСАВА,***
***выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік літаб'яднання "Наднёманскія галасы".***

* * *

Нібы восеньскі дождж.
Разаб'юся аб шэры асфальт.
Буду меньшым, чым ёсьць,
І такім жа халодным, бы
сталь.
Не спрабуй пазіраць
У люстэрка самотнай вады.
Бо вада - гэта я,
І на жаль, у ва мне больш
не ты.
У ва мне мая злосьць,
Мая дурасьць таксама
ў ва мне
Разаб'юся, бы дождж.
Расцякуся па чорным
вакне.

* * *

Што страшней - ці памерці,
ці жыць.
Каб калісьці памерці
ўсёроўна?
Мне шкада, што ніводнай
душы
Навакол, толькі мёртвая
поўня.
Толькі мёртвае неба і я.
Плачуць зоркі ў шэрай
пустэльні
Мары збудуцца толькі
ў снах.
Ну а шчасьця ня будзе,
павер мне.
Шчасьце прыйдзе таксама
у сьне,
Альбо прыйдзе, калі нас
ня будзе.
Лепш памерці, чым жыць
у труне,
І зграшыць, чым прабачыць
Іудзе...

* * *

Іду, а за мною ніякіх
сьлядоў,
Сьляды праглынае сухая
лістота.
І мроіцца мне, што
наперадзе дом,
А ў доме чакаюць майго
надыходу.
Таму не баюся, што
пройдуць гады,
А можа і меней, і ў момант
якісьці
Мяне праглынае, нібы тыя
сьляды.
Апаўшае некалі,
шэрае лісьце.



## НОВЫ ДЗЕНЬ

Мяне вітае новы дзень
Сваім сьвятлом цераз
вакно.
З абломкаў вецер зьняў
прамень
І тчэ нябёсаў палатно.

Блукае сонца сярод хмар,
А потым зваліцца, бы куль.
Запаліць поўня свой алтар,
Пакліча зорак, а пакуль

Бялее дзень цераз вакно,
І я гляджу на новы сьвет,
Як на цікавае кіно,
Згубіўшы недзе свой білет.

* * *

У хвалі ранка зоркі патанулі,
нібы каменьне з чорнае
рапьлі.
Вылазіць сонца з бронзавай
кашулі,
каб павітаць галодныя палі.

На дрэвах шэрань - зімнае
каханьне.
Пад дрэвамі - марудная
трава.
Пайду туды, дзе ноччу
крочыць зданьне,
дзе думак, як паветра,
не чуваць.

* * *

Дзень уступіць мейсца
змроку.
Мяккі сьнег схавае крокі
ад вачэй.

Сон кладзецца на дарогу.
І нічога ад былога,
ад завей.

Вечар вечнасьць рассыпае,
а наўкол самота злая
нібы цьвік.

Зоры, быццам аксаміты...
Дрэмле, хмарамі спавіты,
маладзік.

Трэба спаць. Навошта
вохаць?
Каб дзяцей малых палохаць,
прыйдзе страх.

Паказыча кіпцем вось ім.
Скалыхнецца бляск дзівосны
на платах...



# Бібліятэка інфармуе, канстатуе, папярэджвае...

## 200 ксеракопій у дзень

Тое, аб чым так доўга марылі работнікі і наведвальнікі бібліятэкі універсітэта, нарэшце спраўдзілася. Нягледзячы на цяжкасць фінансавага становішча, універсітэт знайшоў магчымасць набыць для бібліятэкі ксеракс. Устаноўлены ён у 103-м пакоі галоўнага корпуса, і тут можна за невялікую плату атрымаць ксеракопію любога артыкула з газеты ці часопіса, любой старонкі падручніка ці даведніка. Можа, нарэшце нашы студэнты не будуць псаваць дарагую літаратуру, вырываючы з кніг старонкі, а то і цэлыя раздзелы...

Ксеракс ужо падрыхтаваны да работы, штодзень можа выдаваць да 200 копій - такая яго максімальная магутнасць, яна дастатковая для патрэб бібліятэкі.

***В. СТАНКЕВІЧ,***
***загадчык бібліятэкі.***

## Адгукніцеся, даўжнікі!

Да 1 лістапада працягнецца перарэгістрацыя чытачоў універсітэцкай бібліятэкі. Часу даволі дастаткова, каб выбраць зручны момант і наведаць аддзел абслугоўвання. Гэта трэба зрабіць і выкладчыкам, і супрацоўнікам, і студэнтам.

На вялікі жаль, многія з іх даўно ўжо абыходзяць нашу бібліятэку, хоць лічацца ў даўжніках. І калі студэнты-даўжнікі больш-менш пад нашым кантролем, дык з выкладчыкамі весці размову яшчэ цяжэй... Бясконца нагадваць аб адным і тым жа не першы год ужо неяк нават няёмка... Працуе ва універсітэце, напрыклад, сталы паважаны чалавек, прафесар. Ён ужо колькі часу як павінен нашай бібліятэцы... 76 кніг. З этычных меркаванняў не называем пакуль што сёння імя гэтага чытача, зазначу толькі, што нумар яго абаненцкай кніжкі 389. А з часам, можа, прыйдзецца назваць і імя, калі чалавек не адгукнецца на нашы заўвагі.

Калі ласка, не адкладайце наведванне бібліятэкі, перарэгіструйцеся своечасова, здайце кніжкі, якіх, напэўна, чакаюць іншыя.

***А. СЯМЁНАВА,***
***загадчыца аддзела абслугоўвання.***

## ГЭТА ВАМ ПАТРЭБНА!

**У летнія месяцы, пакуль выкладчыкі і студэнты адпачывалі ад падручнікаў і канспектаў, работнікі бібліятэкі атрымлівалі і камплектавалі новую літаратуру. Назваць усю проста немагчыма. Спынімся толькі на некаторых апошніх выданнях, якія папоўнілі бібліятэку універсітэта, а больш падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у даведачна-інфармацыйным цэнтры.**

*Па псіхалогіі:*

Лейтц Г. Психодрама: теория и практика. Классическая психодрама... - М., 1994.

Вишнякова Н.Ф. Креативная психопедагогика: психология творческого обучения. - Мн., 1995.

Баркер Ф. Использование метафор в психотерапии. - Воронеж, 1995.

Карелин А. Снег на листьях, или Психотехнология успеха. - Саратов, 1994.

Секун В.И. Психология активности. - Мн., 1996.

Бэндлер Р. Семейная терапия: книга, углубляющая наши познания о том, как быть человеком. - Воронеж, 1993.

Матюгин И.Ю. Методы развития памяти, образного мышления, воображения. - М., 1996.

Чистякова М.И. Психогимнастика. - М, 1995.

Спатрэбяцца нашым студэнтам і падручнікі (кожны - у трох кнігах) Немава Р.С. па агульных асновах псіхалогіі, па псіхалогіі адукацыі, па эксперыментальнай педагагічнай псіхалогіі і псіхадыягностыцы, а таксама зборнікі тэстаў, шматлікія метадычныя дапаможнікі.

*Па педагогіцы:*

Занков Л.В. Избранные педагогические труды. - М., 1996.

Венгер Л.А. Домашняя школа. - М., 1994.

Андреев В.И. Система образования в Японии. - Мн., 1995.

Никитин Б.П. Развивающие игры. - М., 1994.

*Па праграмаванню:*

Крол Эд. Все об INTERNET. - 1995.

Шикин Е.В. Компьютерная графика: динамика, реалистические изображения. - М., 1996.

Аглицкий Д.С. Персональный компьютер и WINDOWS для всех. - М., 1995.

Секреты программирования игр. Перевод с англ. - Питер, 1995.

Спіс гэты можна працягваць. Але лепш - звярнуцца ў бібліятэку!

***Ф. САМОЙЛАВА.***

## "Сакрэты" аптычнага дыска

Даведачна-інфармацыйны цэнтр універсітэта штотыдзень атрымлівае дыскеты з інфармацыяй "CUPPENT CONTENTS" аб новай літаратуры па фізіцы, хіміі, інфарматыцы, вылічальнай тэхніцы, матэматыцы, камп'ютарах, біялогіі і г.д. Усе даведкі будуць карыснымі для выкладчыкаў і аспірантаў, студэнтаў-дыпломнікаў і ўсіх тых, хто займаецца навуковымі даследаваннямі.

Нарэшце атрымалі мы чарговы доўгачаканы CD-ROM з Расійскай Акадэміі навук. Аптычны дыск утрымлівае 250 тысяч адзінак запісу інфармацыі, а гэта - досыць змястоўныя даведкі па мовазнаўству, літаратуры, гісторыі, эканоміцы, юрыспрудэнцыі і г.д. Дарэчы, нагадаю, што ў нашым цэнтры маецца інфармацыя аб усіх навуковых канферэнцыях, якія маюць адбыцца не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў краінах СНД, Польшчы, Карэі, Амерыцы і інш.

І, безумоўна, у нас можна атрымаць даведку аб усёй новай літаратуры, што рэгулярна папаўняе бібліятэку універсітэта.

Навучальны год толькі пачынаецца. Каб крочыць у нагу з часам, каб лепш арыентавацца ў бясконцай інфармацыйнай прасторы - звяртайцеся у наш даведачна-інфармацыйны цэнтр.

***Ф. ЛЯЛЬЧУК,***
***загадчыца даведачна-інфармацыйным цэнтрам універсітэта.***

## Увага: студэнцкі конкурс!

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь зноў праводзіць конкурс навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках. Такія конкурсы, паказала практыка, з'яўляюцца адным з эфектыўных сродкаў павышэння якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, яны стымулююць творчы пошук студэнтаў, садзейнічаюць паглыбленню тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў. У конкурсе могуць удзельнічаць асобныя студэнты і цэлыя студэнцкія калектывы, а таксама выпускнікі, якія закончылі вну ў год правядзення конкурсу. Работы студэнтаў вячэрняй і завочнай форм навучання могуць таксама накіраўвацца для ўдзелу ў конкурсе.

Навуковыя работы студэнтаў накіроўваюцца ў конкурсныя камісіі да 25 кастрычніка. Па ўсіх пытаннях удзелу ў конкурсе можна звяртацца ў навуковы аддзел універсітэта (пакой № 201 галоўнага корпуса) тэл. 444-158.

Дарэчы, згодна з загадам міністра адукацыі і навукі наш універсітэт ужо трэці год будзе базавай установай па раздзелу "Фізічныя навукі".

Застаецца пажадаць, каб нашы факультэты ў поўнай меры выкарысталі магчымасці конкурсу, каб па-за іх увагай не засталіся цікавыя, змястоўныя навуковыя работы студэнтаў, каб больш сярод іх стала лаўрэатаў. А пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі, ім будзе нададзена званне лаўрэатаў конкурсу, атрымаюць яны і грашовыя прэміі.

*Н. БАБАРЫКА,*
*інжынер навуковага аддзела.*

## ИНФОРМАЦИОННОЕ ПИСЬМО

***ЖЕНСКИЙ НЕГОСУДАРСТВЕННЫЙ ИНСТИТУТ "ЭНВИЛА", ЕВРОПЕЙСКИЙ ГУМАНИТАРНЫЙ УНИВЕРСИТЕТ 9-10 ДЕКАБРЯ ПРОВОДЯТ МЕЖДУНАРОДНУЮ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКУЮ КОНФЕРЕНЦИЮ: "ЖЕНЩИНА И ДЕМОКРАТИЯ: ПРОБЛЕМЫ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО И ПОЛИТИЧЕСКОГО УЧАСТИЯ"***

На конференции предполагается работа следующих секций:

*1. Гендерные проблемы социально-экономического развития:*
- становление рыночных отношений и проблемы занятости женщин;
- изменение социальных ролей женщин в условиях развития рынка;
- профессиональная карьера женщины: проблемы и перспективы;
- государство и охрана материнства и детства;
- социальное обеспечение и демографические перспективы;
- физическое и психосоматическое здоровье женщины.

*2. Становление демократии и политическое участие женщин:*
- женщина и политическое лидерство;
- женские политические партии;
- женские общественные движения;
- женщина и социально-политическая активность;
- гендерная политика и развитие демократии.

*3. Гендерные исследования и образование:*
- женское образование: проблемы становления и развития;
- непрерывное женское образование: проблемы и перспективы;
- гендерный компонент в образовании: зарубежный опыт;
- женское образование и проблемы профессиональной карьеры женщины;
- женское образование и возможности самореализации женщины.

Предполагается издание сборника материалов конференции. В ходе конференции будет работать выставка-продажа учебно-программной продукции и состоится конкурс учебно-методических материалов (программ, учебно-тематических комплексов, аудиовизуальных средств обучения и т.д.). Победители конкурса получат денежное вознаграждение.

Для участия в конференции необходимо до 1 ноября 1996 года выслать по адресу **220002, г. Минск, а/я 200** Шатон Галине Иосифовне заявки на участие в конференции (с указанием фамилии, имени, отчества (полностью), места работы, должности, ученой степени, звания, контактных телефонов), **тезисы** выступлений (объемом до трех машинописных страниц, напечатанных через полтора интервала).

**Телефоны для справок: 2260-419; 2260-687.**

# "ДНІ ФАКУЛЬТЭТА" НЕЗАБЫЎНЫЯ



Калі даводзіцца пісаць аб справе, да якой маеш непасрэднае дачыненне, вельмі цяжка захоўваць становішча назіральніка, які можа метадычна пералічваць усе моцныя і слабыя бакі зробленага і выносіць вердыкт накшталт таго, як трэба працаваць далей. Безумоўна, знойдзецца чалавек, які тыя ж нататкі, што прапануюцца вашай увазе, палічыць суб'ектыўнымі.

Тры гады таму на былым філалагічным факультэце (зараз факультэт замежных моваў) адбываліся вельмі цікавыя падзеі. З'явіўся новы дэкан, а з ім і нязвыклая на той час пасада намесніка па выхаваўчай працы, што сведчыла пра зацікаўленасць кіраўніцтва факультэта ў развіцці гэтай сферы. І ў той жа час невялікая група энтузіястаў-першакурснікаў, ахопленых жаданнем зрабіць свае студэнцкія гады насычанымі не толькі вучэбнымі мерапрыемствамі, выступіла з прапановай сустрэць Дзень студэнта "капуснікам", традыцыя правядзення якіх на факультэце была на той час страчана. Выступленне адбылося і выклікала пэўны рэзананс, але наўрад ці далей атрымалася б што-небудзь карыснае, калі б не падтрымка і вялікае натхненне з боку намесніка дэкана па выхаваўчай працы Таццяны Міхайлаўны Прудко. Гэта цудоўная жанчына, у якой маладосць душы ўдала спалучаецца з вялікім матчыным сэрцам, прынесла на нашыя сходкі сямейную атмасферу і надзвычай цярпліва пераносіла недарэчнасці нашых характараў і паводзін. За гэта ёй - вялікі дзякуй ад усіх нас. Вясной 1994 года, дзякуючы яе энергіі, адбылося прысвячэнне ў студэнты адразу для трох курсаў, для якіх у свой час нічога падобнага не арганізоўвалася. "Дні факультэта" ў той год былі адметныя пастаноўкай уласнага спектакля "Шукайце жанчыну!", дзе ў адрозненне ад традыцыйнага характару студэнцкіх вечароў рабілася спроба і з жартам, і сур'ёзна паразважаць над тэмай жанчыны, жонкі, маці.

Ператварэнне філалагічнага факультэта ў факультэт замежных моваў прынесла новую творчую плынь: пашырылася кола рэальных і патэнцыяльных удзельнікаў нашых праграм, з'явілася магчымасць карыстацца патэнцыялам замежных моваў і культур. І гэта не была накіраванасць выключна на забаўляльныя мерапрыемствы. Сведчаннем таму з'яўляецца "агеньчык" для ветэранаў, удзел студэнтаў у добраўладкаванні воінскіх магілак і інш.

І ёсць спадзяванні (думаю, што не толькі ўласна ў мяне), што ў выхаваўчай працы на факультэце знойдзе развіццё менавіта такі напрамак. Бо універсітэт - гэта не проста месца, дзе займаюцца вучэбнай і навуковай дзейнасцю, а вышэйшая адукацыя не ёсць толькі адукацыя прафесійная. Калі чалавек жадае вадзіць аўтамабіль, ён павінен прайсці адпаведную падрыхтоўку і атрымаць правы. Пры перанясенні гэтай сітуацыі ва ўмовы вну можна зазначыць: дыплом - гэта не правы на кіраванне аўтамабілем, гэта - сам аўтамабіль. А правы на яго - узровень развіцця нашага сэрца, нашай здольнасці паважаць і любіць людзей, служыць ім. Калі мы развіваем толькі інтэлект, то дыплом і тое становішча, якое ён дае ў жыцці, ператвараецца ў спосаб на больш высокім узроўні псаваць жыццё тым, хто побач з намі - і на працы, і ў сям'і. Таму такая адукацыя, як "адукацыя сэрца" павінна заняць адпаведнае месца ў сценах універсітэта. Спадзяюся, што наш факультэт адным з першых пайшоў у гэтым напрамку.

*А. МАЦЭВІЛА,*
*студэнт 3-га курса*
*факультэта замежных моў.*



*Пяро нарыпела*

# “Шэдэўры” са сшыткаў

Штогод прыходзіць новае папаўненне ў нашы аудыторыі. Мяркуецца, што гэта найбольш падрыхтаваная моладзь з ліку абітурыентаў. Многім не пашчасціла стаць студэнтамі. Чаму не пашчасціла? Можа, таму, што ў сярэдняй школе яны мелі “белыя плямы” ў сваёй адукацыі, якія вельмі выразна высветліліся на ўступных экзаменах.

Сёння мы друкуем цікавы матэрыял, сабраны не за адзін год дацэнтам кафедры рускай мовы С.М. Антонавай на ўступных экзаменах. На яе думку, “абитуриенты расширяют словарный состав русского языка и перешагивают запреты орфографии, они... корректируют задания экзаменаторов, утверждают невозможное, философствуют на грани фантастики...”Аднак мяркуйце самі...

*Орфографические изобретения и неологизмы абитуриентов:*

- моя страдальная семья;
- собасня;
- сталистические фигуры;
- безрассудительные действия;
- счетовидная железа;
- похали землю;
- демострация;
- развращонность, груботa в отношении к людям;
- непотдельная страсть;
- Салтыков-Щедрин часто использовал прием фактически (читай: фантастики. Шпаргалка подвела?)
- ипиграмма, периуд;
- Гребоедов;
- повесть о том, как мужик двух генералов покормил.

*Абитуриенты утверждают...*

“ А.С. Пушкин написал много стихов о своей няне, например, “Ты жива еще, моя старушка?”

“Большой достопримечательностью Белоруссии является белорусский человек”.

"Давным-давно люди делали хлеб из всего того, что находилось у них в доме из продуктов".

“Избороздив родную планету, человек взялся за космос, заменив керосиновые фонари на электрические лампы, человек изучает новую энергию - энергию атома”.

“Раневская и Гаев не умеют ухватиться за хворостинку жизни и присосаться к ней с новыми силами”.

“Тихон - сын Дикого и Кабанихи”.

“Дома он - обыватель, прикрывающийся женой”.

*Абитуриенты анализируют...*

"Роман “Преступление и наказание” можно назвать ценным шедевром, так как он стоит вместе с “Анной Снегиной” С. Есенина, “Войной и миром” Л.Н. Толстого, “Фаустом” и другими великими произведениями".

“Главный герой Раскольников. Он живет в лачуге, ходит оборванным, в лохмотьях, он даже не может заняться преподавательской деятельностью. Он убивает старуху, чтобы проверить, вошь ли он или кто другой. Он хотит быть похожим на Кутузова”.

“Запах хлеба - это, конечно, не запах французских духов, так модных в это время, пусть он так прост, но заключает в себе душу, сердце и, может быть, жизнь конкретного человека”.

“Тема сочинения: “Мотивы любви и дружбы в лирике А.С. Пушкина”

Эпиграф: “Жить без любви нельзя на свете, нет...” Из газет.

Любовь и дружба... Эти два понятия синонимичные. На мой взгляд, это самые главные вещи в жизни, это то, ради чего человек рождается и живет, это смысл его бытия!"

“Роман в стихах “Евгений Онегин", на мой взгляд, наивысшая ступень на лестнице пушкинской поэзии!

“Вот почему все люди ссылаются на пословицу: что посадишь, то и пожнешь.

“Много произведений, написанных на тему, связанную с хлебом. Этот раздел включает в себя такие произведения, как “Хлеб”, “Хлеб - наше богатство”, “Слава хлебу на столе” и многие другие. Во всех этих произведениях прививается любовь к хлебу, чтобы им обращались по-человечески, чтобы не выкидали, не бросали, не издевались над хлебом.

Сделаем вывод, у людей, работа которых связана с хлебом, руки очень умелые, добрые. Их руки можно назвать: “Руки мастера”. Мы этих людей должны ценить, потому что они нас кормят, на сегодняшний день нет семьи, которая бы не покупала или не принимала в пищу хлеб. Поэтому людям этим мы должны быть благодарны всю нашу жизнь. Поэтому и говорят: “Хвала рукам, что пахнут хлебом”.

"Поэт встал против этого света, но был задушен и убит этим светом".

"Гротеск в изображении образа ожившего Маркса, призывающего свергнуть головы канарейкам".

"60-е года XIX века... Именно в это время, когда появляется возможность говорить правду, высказывать свободно свои мысли о настоящем и будущем положении России, появляются на арене литературы такие знаменитые всему миру люди, как Н. Г. Чернышевский, М.Е. Достоевский, А.М. Горький, А.Н. Толстой, Гончаров".

"Писатель показывает нам те ужасы, которые легли на спины солдат".

**Редакция благодарит Светлану Михайловну за эту подборку “шедевров” и надеется, что ее дополнят наши читатели.**

## Нашы не падвялі!

Аб гэтай неардынарнай у спартыўным жыцці падзеі ўжо напісалі многія газеты, свае рэпартажы перадало тэлебачанне. Адкрыццё ў нашым горадзе новай залы па грэка-рымскай барацьбе супала з гульнямі першага тура розыгрышу Кубка Еўропы. Пасля выдатнага выступлення гродзенскіх “класікаў” у Атланце не было сумнення, што поспех паспрыяе ім і ў родных сценах. А сустракаліся нашы спартсмены з камандай з Харватыі.

Не абмяркоўваючы дэталяў паядынкаў, зазначу адразу, што нашы землякі выйшлі пераможцамі ў дзевяці схватках з дзесяці. Поспех садзейнічаў алімпійскім прызёрам Аляксандру Паўлаву, Валерыю Цыленьцю, Аляксандру Сідарэнку. Выдатна выступілі і іншыя прадстаўнікі гродзенскай каманды. У выніку - бясспрэчная перамога нашых “класікаў” над харвацкімі.

Калі гэты нумар газеты выйдзе ў свет, ужо будуць вядомыя вынікі гульняў у Заграбе, якія прайшлі ў апошнія дні верасня. Адтуль, няма сумнення, гродзенскай камандзе будзе адчынены шлях у другі тур розыгрышу Кубка Еўропы.

* * *

І сапраўды, нашы волаты пад кіраўніцтвам Заслужанага трэнера СССР В.А. Максімовіча выйгралі сустрэчу з харватамі ў Заграбе з лікам 8:2. А яшчэ яны прывезлі ў Гродна Кубак Адрыятыкі, які выйгралі таксама ў нялёгкіх паядынках.

**С. ІВАНОВА.**


*Рэдактар*
С. МУРЫНА
*Камп'ютарная вёрстка*
Ю.РАДСА
*Камп'ютарны набор*
М.ВЕРСТАК

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.
44-72-97

Здадзена ў набор 23.09.96
Заказ 69
Наклад 500 асобнікаў.

Заснавальнікі: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.